баланс интеллектуальных, эмоциональных и двигательных нагрузок; деятельностный подход; развивающий характер обучения, основанный на детской активности.

В патриотическом и духовно-нравственном воспитании огромное значение имеет пример взрослых, в особенности же близких людей. На конкретных фактах из жизни старших членов семьи (дедушек и бабушек, участников Великой Отечественной войны, их фронтовых и трудовых подвигов) необходимо привить детям такие важные понятия, как «долг перед Родиной», «любовь к Отечеству», «трудовой подвиг» и т. д. Важно подвести ребёнка к пониманию, что мы победили потому, что любим свою Отчизну, Родина чтит своих героев, отдавших жизнь за счастье людей. Их имена увековечены в названиях городов, улиц, площадей, в их честь воздвигнуты памятники.

Подводя итог, можно отметить, что патриотическое и духовно-нравственное воспитание, воспитание гражданина своей страны – одна из трудных, но приоритетных задач современной школы. Необходимо всем педагогам создавать условия для того, чтобы учащиеся росли идейно зрелыми, нравственно стойкими и духовно богатыми людьми.

## КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА ТАТАР НА БЕЛАРУСІ

**Паліева Т.У., Ісаханаў М.С., МДПУ імя І.П. Шамякіна**

Беларусь – краіна, на тэрыторыі якой ва ўсе часы мірна суіснавала вялікая колькасць народаў і рэлігій. На нашай зямлі не было значных рэлігійных спрэчак, і ў гэтай частцы Еўропы маглі прытуліцца дыскрымінаваныя народы. Першыя звесткі пра знаходжанне татараў на тэрыторыі Беларусі адносяцца да XIV ст. У 1395 г. Вітаўт прыняў разбітага Цімурам хана Залатой Арды Тахтамыша і яго людзей, якія пасяліліся ў ваколіцах Ліды. Шмат татараў было перасялена ў ВКЛ у выніку сумеснага паходу Вітаўта і Тахтамыша пад Азоў у 1397 г. Татары былі размешчаны каля Вільні, у Лідскім, Ашмянскім, Навагародскім, Берасцейскім паветах [1, с. 20]. Аднак некаторая частка татараў існавала тут і раней, бо, як згадвае ў сваёй працы прафесар турэцкай славеснасці А. Мухлінскі «Изследованіе происхожденіи и состояній татаръ», яны ў 1319 г., падчас княжання Гедыміна, бралі ўдзел у бітвах супраць тэўтонцаў: «Такъ уже въ сраженій 1319 г. съ Тевтонскимъ Орденомъ участвуютъ и Татары составляя передовое войско Гедимина» [2].

У Беларусі татары пасяляліся родаплемяннымі групамі (улусамі). Усе ваеннаслужачыя татары падзяляліся на харуствы (тыя ж племянныя ўлусы), а ў ваенных адносінах – на сцягі (атрады). Падзел на ўлусы існаваў у татараў Беларусі да канца XVII ст. Паводле сацыяльна-эканамічнага стану татарскае насельніцтва на землях ВКЛ у XVI–XVII стст. дзеліцца на тры катэгорыі. Прамыя нашчадкі ардынскіх ханаў і мурзаў – найбольш прывілеяваная група. Яны валодалі вялікімі вотчынамі з сялянамі, за што павінны былі несці вайсковую службу. Нашчадкі простых воінаў, якія атрымалі невялікія зямельныя надзелы і, апрача вайсковай службы выконвалі павіннасці на карысць вялікага князя (транспартную, кур'ерскую, вартавую і інш.). Гарадскія («простыя») татары – самая бедная група, якая сфарміравалася з шэрагу тых перасяленцаў, якія на гістарычнай радзіме былі не феадаламі, а вольнымі, або залежнымі, «ясачнымі людзьмі». У гарадах і мястэчках ім адводзілася зямля пад сядзібы і агароды. Яны неслі павіннасці, як і мяшчане, плацілі пагалоўны падатак. Асноўнымі іх заняткамі былі рамесніцтва, гарбарства, агародніцтва. Негледзячы на пэўныя льготы і рэлігійную верацярпімасць (свабодна дазвалялася вызнаваць іслам і будаваць мячэці), татары ў ВКЛ не мелі права ўдзельнічаць у выбарах у сойм і мясцовыя соймікі, займаць вышэйшыя дзяржаўныя пасады [3, с. 357].

Татары існуюць на тэрыторыі Беларусі больш за 500 гадоў, але ў адрозненні ад іншых народаў, якія жывуць побач з намі, татары не асіміляваліся канчаткова, бо захавалі за сабой веру сваіх продкаў і правапісанне. Але размаўляць яны сталі на старабеларускай мове, з-за гэтага ў нас з'явіўся яшчэ адзін варыянт правапісу. Пісьменнікі прыстасавалі



МГПУ им. И.П. Шамякина

арабіцу да беларускіх гукаў, прыдумаўшы ў ёй адмысловыя значкі для гукаў «дз» і «ц», ды пісалі так, як вымаўлялі [4, с. 90]. Па адзначаных прычынах на тэрыторыі Бедарусі захавалася шмат літаратуры беларуска-літоўскіх татараў – кітабы (кнігі з легендарным, казачным, маральна-этычным, павучальным зместам), тэджвіды (кнігі-падручнікі па навуцы чытання Карана), тэфсіры (кнігі-падручнікі з каментарыямі і тлумачэннямі Карана), хамаілы (малітоўнікі) і інш [3, с. 358].

«Аль-Кітаб» быў знойдзены ў 1915 г. у «Сорак Татарах» пад Вільняй археолагам Іванам Луцкевічам, а у 1925 г. у бібліятэцы духоўнай семінарыі ў Пскове было знойдзена некалькі арабскіх рукапісаў. У 1920–1921 гг. у Пецярбургскім універсітэце Крачоўскі (беларус) знайшоў 4 кнігі, пісаныя па-беларуску арабіцаю: 2 зборнікі малітваў, 2 пераклады Карану. У 1926–1927 гг. у савецкай Беларусі беларус Віталь Вольскі знайшоў адзін «Кітаб» [4, с. 91].

Пасля Вялікай Айчыннай вайны рэлігійнае жыццё татараў-мусульман у БССР працягвала згортвацца. Калі на пачатак 1946 г. дзейнічалі 7 мусульманскіх школ, то на 1 студзеня 1948 г. іх налічвалася ўжо 4. У сучаснай Беларусі пачаўся новы этап жыцця беларускіх татараў. Актыўна дзейнічае мусульманскае рэлігійнае аб'яднанне ў Рэспубліцы Беларусь (створана ў 1994 г.), якое каардынуе і накіроўвае працу ў новаствораных мусульманскіх абшчынах у Мінску, Навагрудку, Гродна, Іўе, Оршы і інш. Беларускімі татарамі перыядычна друкуецца часопіс «Байрам». Часопіс заснаваў выбітны беларускі энцыклапедыст Якуб Адамавіч Якубоўскі, вялікую ролю ў яго выданні адыгрываў слынны гісторык Ібрагім Барысавіч Канапацкі. З 1991 па 2023 гг. свет пабачылі 49 нумароў, якія паднялі беларускае татаразнаўства на высокі ўзровень. Тэматыка часопіса – гісторыя, культура і рэлігійнае жыццё татараў-мусульман на землях былога Вялікага Княства Літоўскага. Апошнія гады тэматыка пашыраецца, былі дададзены матэрыялы, якія тычацца розных аспектаў ісламскай культуры і этыкі [5].

Па ініцыятыве татарскай супольнасці ў Беларусі быў праведзены шэраг міжнародных навучна-практычных канферэнцый па праблемах, звязаных з вывучэннем і захаваннем багатай культурнай спадчыны татарскага народа ў Беларусі. На цяперашні час нашчадкі татараў уносяць вялікі ўклад у развіццё навукі, культуры і мастацтва. Народ Беларусі ганарыцца доктарам філалагічных навук, прафесарам, заслужаным працаўнiком культуры С. Аляксандровічам, член-карэспандэнтам Нацыянальнай акадэміі Беларусі Б. Смольскім; лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР, загадчыкам рэдакцыі выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя» Я. Якубоўскім і іншымі выбітнымі прадстаўнікамі беларускіх татараў [1, с. 21].

Гледзячы на гісторыю беларускіх татар і іх уклад у гісторыю нашай краіны, трэба падкрэсліць важнасць духоўна-маральнага выхавання, бо менавіта разуменне таго, што шмат народаў супольна працавалі дзеля развіцця беларускай культуры, дапамагае беларусам усведамляць неабходнасць культурнага абмену з рознымі этнасамі, а таксама фарміраваць у маладога пакалення павагу да людзей з іншых краін і іх культурных асаблівасцей.

*Артыкул падрыхтаваны пры падтрымцы БРФФД, грант №Г23ІП-026*

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Смолик, А. И. Интеграция крымских татар в белорусское социально-культурное пространство / А. И. Смолик // Культура народов Причерноморья с древнейших времен до наших дней : материалы XLI Междунар. науч. чтений, Симферополь, 23–24 ноября 2016 г. ; Крымский федеральный университет. – Симферополь, 2017. – С. 20–24.

2. Мухлинский, А. О. Исследование о происхождении и состоянии литовских татар / А. О. Мухлинский. – Санкт-Петербург, 1857 (2017). – URL: https://elib.rgo.ru/handle/-123456789/218724 (дата обращения: 28.10.2024).

3. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці: вучэбны дапаможнік / І. А. Марзалюк [і інш.] ; пад агульнай рэд. І. А. Марзалюка. – Мн. : Адукацыя і выхаванне, 2022. – 447 с.



МГПУ им. И.П. Шамякина

4. Станкевіч, Я. Беларускія мусульмане і беларуская літаратура арабскім пісьмом / Я. Станкевіч // Спадчына. –1992. – № 3. – С. 90–95.
5. Журнал Байрам. – 2023. – № 49. – URL: https://www.islambel.by/our-editions?pgid=lhhhjs8q-9a8910af-74c7-468b-8864-a1aa78122a5c (дата обращения: 28.10.2024).

## СОХРАНЕНИЕ ИСТОРИЧЕСКОЙ ПАМЯТИ ЧЕРЕЗ РАБОТУ ЦЕНТРА ПО ГРАЖДАНСКО-ПАТРИОТИЧЕСКОМУ ВОСПИТАНИЮ

**Петрова А.В., ГУО «Средняя школа № 16 г. Полоцка»**

Гражданско-патриотическое и духовно-нравственное воспитание учащихся уже много лет является приоритетными направлениями в работе учреждения образования. Большое внимание в своей работе мы уделяем истории Великой Отечественной войны, собираем материалы, связанные с военными событиями на Полотчине и судьбами их участников. Этой важной теме посвящен один из кабинетов школы, в котором была организована экспозиция «Война. Победа. Память», приуроченная к 75-летию освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков. Экспозиция включает материалы и документы, воспоминания и экспонаты, отражающие основные этапы Великой Отечественной войны.

Многие экспонаты были найдены нашими учащимися в рамках поисково-исследовательской деятельности. С 2016 г. в учреждении был создан поисково-исследовательский отряд «Память». Основным направлением его работы является изучение самого крупного военного конфликта в истории человечества – Второй мировой войны. Работа отряда построена на изучении событий, которые затронули Полотчину – нашу малую Родину. Уже который год наша поисковая группа совершает походы по местам, где проходили боевые действия с 1941 по 1944 г. За это время совершено более 80 походов. Благодаря работе поискового отряда и собранной экспозиции активно ведется исследовательская деятельность. На основе экспозиции созданы многочисленные исследовательские работы, такие как «Роль Полоцкого укрепрайона в оборонительных боях на территории Беларуси летом 1941 года», «Взаимодействие партизан и Красной Армии при освобождении территории Беларуси в 1943–1944 гг.», «Стратегическая наступательная операция «Багратион» и другие.

В феврале 2022 г. в рамках Года исторической памяти в нашем районе стартовал проект «Полоцкий рубеж». Проект дает возможность подрастающему поколению ознакомиться с героическими и самыми трагическими событиями июля 1941 г., когда на линиях Полоцкого укрепрайона решалась судьба страны. «Полоцкий рубеж» управления по образованию Полоцкого районного исполнительного комитета – это связующая нить между учащимися и военнослужащими. Это совместная работа важна как для учащихся, так и для военнослужащих Полоцкого гарнизона, которые оказывают нам большую практическую помощь.

Сохранение исторической памяти о героях Полоцкой обороны – это та задача, которая объединила в едином порыве учащихся и педагогов, историков и краеведов. За время участия в проекте ребятами из поисково-исследовательского отряда были проведены десятки мероприятий. Учащиеся под руководством своих кураторов составляли туристско-краеведческие образовательные маршруты, принимали участие в Вахтах Памяти, занимались благоустройством памятников и братских захоронений воинов, партизан и мирных жителей, павших в годы Великой Отечественной войны.

В ходе исследований ребята из поискового отряда «Отвага» узнали имена и фамилии командиров полков, дивизий и других воинских соединений, подняли архивные материалы, изучали карты военных действий, тесно взаимодействовали с работниками краеведческого музея, музея Боевой славы, Полоцкого государственного университета, где нашло подтверждение значимость работы над проектом «Полоцкий

МГПУ им. И.П. Шамякина